## Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Міёрская дзіцячая школа мастацтваў»



Адрас: г. Міёры, пл. Леніна 14а.
Дырэктар – Лавец Ігар Уладзіміравіч
тэл. 4 15 93
Заг. навучальнай часткі – Каськевіч Жанна Валер'еўна тэл. 4 15 93
Час працы: Пн. – пт. с 8.00 – 18.00, перапынак с 12.00 – 14.00
Сб., ндз. – выхадныя.
Адрас электроннай пошты: miory.dschi2012@yandex.by

## Аддзяленні



**1. Фартэпіяна - скрыпічнае аддзяленне**

Клас скрыпкі
Клас фартэпіяна
Загадчык аддзялення - Шокель Галіна Казіміраўна



**2. Народнае аддзяленне**
Клас баяна, акардэона
Загадчык аддзялення – Адзінец Вячаслаў Расціслававіч
**3. Народнае струннае аддзяленне**
Клас гітары
Клас цымбалаў
Клас домры, балалайкі
Загадчык аддзялення - Бялевіч Таццяна Нарбертаўна



**4. Харэаграфічнае аддзяленне**

Харэаграфія
Загадчык аддзялення – Катышава Аляксандра Яраславаўна

**5. Выяўленчае аддзяленне**

Загадчк аддзялення - Даргель Наталля Эдуардаўна



Набор у школу

Умовы прыёму: у школу прымаюцца дзеці з 6 гадоў
Прыём заяў з студзеня па верасень
Пры падачы заяў неабходна мець:

• медыцынскую даведку
• копію пасведчання аб нараджэнні

Тэлефон для даведак: 8 (02152) 4 15 93

Пры школе працуе студыя эстэтычнай адукацыі

У студыю прымаюцца ўсе жадаючыя, згодна наяўнасці свабодных месцаў. У падрыхтоўчым класе дзеці на працягу года знаёмяцца з рознымі відамі мастацтва (тэатр, музыка, харэаграфія, выяўленчае мастацтва), у студыях заняткі праходзяць згодна з абраным напрамкам.

Пасля заканчэння студыі эстэтычнай адукацыі навучэнцы, якія паспяхова яе скончылі, залічваюцца ў школу без прыёмных іспытаў на адпаведныя аддзяленні.

У першы клас ажыццяўляецца прыём дзяцей:

ва ўзросце ад шасці да дзевяці гадоў па 7-гадовай праграме, а таксама да 11 гадоў па 5-гадовай праграме на аддзяленні:

• музычнае (фартэпіяна, скрыпка, гітара, цымбалы, балалайка, домра, баян, акардэон)
• выяўленчае
• харэаграфічнае

Прыём у школу ажыццяўляецца на падставе рашэння камісіі па адборы дзяцей па выніках прыёмных выпрабаванняў.

ДУА “Міёрская дзіцячая школа мастацтваў” рэалізуе адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі мастацкага профілю.

У ДУА “Міёрская дзіцячая школа мастацтваў” навучаюцца 386 вучняў, у тым ліку філіялы і інструментальныя класы, па трох накірунках: музычнае, харэаграфічнае і выяўленчае мастацтва.

Тэрмін навучання ў школе 5 і 7 гадоў.

Напрамак дзейнасці "Музычнае" ўключае ў сябе інструментальнае аддзяленне (спецыяльнасці: скрыпка, фартэпіяна, гітара, балалайка, домра, баян, акардэон)

У школе працуюць 37 настаўнікаў, 17 з іх - з вышэйшай адукацыяй, 2 настаўнікі атрымліваюць завочна вышэйшую адукацыю.

Вышэйшую катэгорыю маюць 5 настаўнікаў, першую катэгорыю -15.

У структуру ДУА "Міёрская дзіцячая школа мастацтваў" уваходзяць: Дзісненскі, Язненскі філіялы і інструментальныя класы ў аграгарадках Чапукі і Павяцце, студыя эстэтычнай адукацыі.

У ДУА "Міёрская дзіцячая школа мастацтваў" працуюць творчыя калектывы: са складу навучэнцаў – "узорны аркестр баянаў-акардэонаў, дзіцячыя хоры, харэаграфічныя калектывы, вакальныя групы, трыа гітарыстаў, ансамбль скрыпачоў, ансамбль народных інструментаў;

са складу выкладчыкаў-народны ансамбль народнай песні "Мерыца", інструментальны квінтэт, ансамбль народных інструментаў"Каліна".